На трэцім этапе адбываецца асэнсаванне актывізацыі ўдзельнікаў свята, што знаходзіць праяўленне ў сацыяльнай дзейнасці людзей, у іх водгуках, уражаннях, меркаваннях, эстэтычнай *ацэнцы* таго, што адбылося. Станоўчы грамадскі настрой, мажорны паслясвяточны псіхалагічны клімат садзейнічаюць усведамленню кожным свайго дачынення да ўрачыстасці. Зразумела, што абмеркаванне вынікаў свята павінна закрануць і тыя недахопы, пралікі, што адбыліся пры яго правядзенні. Гэта дапаможа ўдасканаленню правядзення святаў у будучым, выпрацоўцы актыўных сацыяльна-ідэйных адносін да жыцця грамадства, фарміраванні станоўчага грамадскага настрою, уздзеянні на свядомасць удзельнікаў.

Напрыканцы варта нагадаць пра 3 мастацкія прыёмы сцэнічнай тэатралізацыі (Э. Вяршкоўскі): тэатралізацыя кампіліраваная (выкарыстанне вядомых мастацкіх ідэй, вобразаў, форм і аб'яднанне іх сцэнарна-рэжысёрскім ходам); тэатралізацыя арыгінальная (распрацоўка інавацыйных падыходаў пры ўзнаўленні святаў і абрадаў з улікам сучасных змен у жыцці грамадства на аснове беражлівых адносін да этнаграфічнай і фальклорнай першакрыніцы); тэатралізацыя змешаная (спалучэнне першых і другіх мастацкіх прыёмаў). На практыцы болей за ўсё выкарыстоўваюцца змешаныя мастацкія прыёмы тэатралізацыі. Такім чынам, тэатралізацыя – важны мастацкі прыём узнаўлення святочна-абрадавай культуры, накіраваны на вырашэнне разнастайных тэарэтычных, арганізацыйных, мастацкіх, выхаваўчых пытанняў у яскравай выразнай і вобразнай форме.

**Спіс літаратуры:**


1. Аль, Д. Основы драматургии : учебное пособие / Д. Аль. – 4-е изд. – СПб.: СПбГУКИ, 2015. – 280 с.
2. Вершковский, Э. Режиссура клубных массовых представлений : учебное пособие / Э. Вершковский. Л.: ЛГИК, 1981. – 72 с.
3. Генкин, Д. Массовые праздники: учебное пособие для институтов культуры / Д. Генкин. – М.: Просвещение, 1975. – 140 с.
4. Конович, А. Театрализация как метод активизации участников массовой культурно-просветительной работы: автореф. дисс. … канд. пед. наук / А. Конович. – Л.: ЛГИК, 1980. – 19 с.
5. Пави, П. Словарь театра / П. Пави; пер. с фр. – М.: ГИТИС, 2003. – 504 с.
6. Туманов, И. Режиссура массового праздника и театрализованного концерта / И. Туманов. – М.: Просвещение, 1976. – 86 с.
7. Чечетин, А. Основы драматургии театрализованных представлений: История и теория : учебник для студентов институтов культуры / А. Чечетин. – М. : Просвещение, 1981. – 192 с.



*Людміла Клімовіч*


## ТАМАРА ГАРОБЧАНКА: ТЭАТР ЯК МАДЭЛЬ ГАРМАНІЗАВАНАГА СУСВЕТУ


*Ludmila Klimovich*


## TAMARA GAROBCHENKO: THEATER AS A MODEL OF A HARMONIOUS UNIVERSE


*Артыкул прысвечаны творчасці вядомага беларускага крытыка і тэатразнаўцы Тамары Гаробчанкі, даследчыцы праблем гісторыі і сучаснай практыкі айчыннага сцэнічнага мастацтва.*

*The article is devoted to the work of the famous Belarusian critic and theatrical scientist Tamara Garobchenko, a researcher of the problem of history and contemporary practice of the national performing arts.*


*Тэатр павінен стаць месцам, дзе чалавек адчувае сябе часцінкай сусвету.*
– Тамара Гаробчанка

Яе шлях у прафесію быў прадвызначаны. Бацькі вядомага беларускага тэатральнага крытыка Тамары Гаробчанкі (мал. 1) – Яўген Палікарпавіч і Надзея Нічыпараўна былі акцёрамі. Пачыналі яны ў 1930-я гг. пад кіраўніцтвам легендарнага Уладзіслава Галубка ў БДТ-3 (мал. 2). Як адзначаюць даследчыкі, «у сцэнічнай творчасці Галубок наследваў традыцыі стражытнага беларускага народнага тэатра, які ішоў ад скамарохаў, батлеечнікаў, выканаўцаў народнай драмы» [3], а сам У. Галубок як акцёр, драматург, музыка-самавук, мастак, лекар, рэжысёр яскрава прэзентаваў сінкрэтычны архетып традыцыйнага выканаўцы мастацтва вуснай традыцыі (мал. 3). Нездарма існуе гіпотэза, што аўтарам «Несцеркі» з'яўляецца ён, а не В. Вольскі (Зэйдэль), які кіраваў вобыскам ва У. Галубка напярэдадні яго рэпрэсавання [1]. Атмасфера беларускай традыцыйнай супольнасці-грамады (якая звычайна меркавалася яе чальцамі як гарманізаваная і ўпарадкаваная мадэль сусвету), уласцівая трупе У. Галубка, уплывала на светапогляд яе акцёраў і ўзаемаадносіны ў іх сем'ях, дзеці ў якіх падсвядома атрымлівалі своеасаблівую «прышчэпку аўтэнтычнай традыцыі і гармоніі», што, відавочна, не абмінула і маленькую Тамару.



Малюнак 1 – Т. Гаробчанка, 2012



Малюнак 2 – Трупа Беларускага дзяржаўнага тэатра-3, 1933



Малюнак 3 – Фота У. Галубка, а таксама адзін з яго сцэнічных строяў і скрыпка на выставе, 2017 [2]


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатр ўвайшоў у яе свядомасць з дзяцінства трывала, моцна і назаўсёды і галоўнае месца ў ім заняў акцёр. Па іншаму і быць не магло. Маленькая Тамара не ўяўляла сабе, што можна быць кім-небудзь іншым, акрамя актрысы. Першыя спробы, так бы мовіць «касцінг» на прыдатнасць да прафесіі, праходзіў у бараку, непадалёк ад «акцёрскага дома», у якім сям'я мела пакойчык. Маці Надзея Нічыпараўна працавала тады ў Баранавіцкім абласным драматычным тэатры. Калі дарослыя ад'язджалі на гастролі, дзеці наладжвалі свае спектаклі. Старэйшая сястра Ларыса «пісала» п'есу, праз вяроўку перакідваўся «занавес» і... пачынаўся т э а т р.

Прыйшоўшы ў прафесію крытыка праз глыбокае ўсведамленне асноватворнасці акцёрскай творчасці для сцэнічнага мастацтва, Тамара Гаробчанка заўсёды адстойвала права акцёра «быць уладаром сцэны», папярэджвала аб небяспечнасці для раскрыцця артыстычнага таленту празмернага захаплення рэжысурай умоўнымі тэатральнымі прыёмамі, знешняй відовішчнасцю, гаварыла аб негатыўным уплыве на яго адсутнасці глыбокіх, змястоўных роляў, недастатковай занятасці ў рэпертуары.

Створаныя ёю творчыя партрэты, нарысы, прысвечаныя беларускім акцёрам, – гэта перш за ўсё прызнанне ў любві, захапленне адметным майстэрствам, выказванне вялікай пашаны і ўдзячнасці за падараванае са сцэны свята ўзрушэнняў і перажыванняў, за моманты сцвярджэння ісціны, выяўленыя ў слове, жэсце, руху, у спалучэнні думак і пачуццяў. Яе манаграфіі аб актрысах Вользе Галіне і Зінаідзе Канапельцы падкупляюць не толькі прафесійнай, але і па-чалавечы шчырай адданасцю аўтара свайму захапленню.

Дарычы, з акцёрамі коласаўскага тэатра, у прыватнасці з Зінаідай Канапелькай і яе мужам Фёдарам Шмакавым, Таццянай Бандарчык, Ларысай Федчанка ў Тамары Яўгенаўны былі асаблівыя стасункі. Пачатак ім пакладзены ў далёкім 1944 г., калі яе бацьку Я. Гаробчанку і маці Н. Шкалярэнку прынялі ў БДТ-2 (другі па значэнні тэатр Беларусі, зараз – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску). Не паспелі яны як след уладкавацца на новым месцы, як бацьку арыштавалі. І жонка «ворага народа» засталася з дзвюма маленькімі дочкамі на руках у чужым горадзе. Бяда не прыходзіць адна. Двухгадовая Тамара моцна захварэла. Лекаў не было, а купіць іх на «чорным» рынку за шалёныя грошы сям'я не магла. І вось аднойчы, прыйшоў Ф. Шмакаў і прынёс выратавальныя таблеткі. Дзё ён іх узяў і колькі яны каштавалі Тамара Яўгенаўна так ніколі і не даведалася. Дзякуючы ім, яна засталася жыць. Заўсёды з вялікай пашанай і ўдзячнасцю ўзгадваліся ў сям'і Гаробчанкаў імёны выратавальнікаў. Акцёр застаўся для яе галоўнай асобай у тэатры. «З вялікай павагай стаўлюся да любой прафесіі ў мастацтве, і ўсё ж такі схіляю галаву менавіта перад акцёрскай прафесіяй як адной з самых высакародных...», – напіша Т. Гаробчанка ў адным з артыкулаў.

Ёй аднолькава падуладны ўсе жанры. Ад творчых партрэтаў, рэцэнзій – да сур'ёзных навуковых прац. Колькі іх выйшла з пад пяра таленавітага крытыка за 40 гадоў, пакладзеных на алтар гэтай рэдкай, амаль знікаючай у Беларусі прафесіі. У яе матэрыялах заўсёды адчуваецца прысутнасць асобы аўтара, што ў сваю чаргу прадугледжвае адметнасць мыслення і своеасаблівасць падачы матэрыялу. За графічнай адточанасцю выказванняў, элегантна пабудаванымі разважаннямі, лёгкасцю стылю прасочваецца ёмістасць і глыбіня думкі, выдатнае веданне сцэны, тонкае адчуванне жанру. Дарэчы, яе ўлюблёны жанр – рэцэнзія. Пра спектакль Т. Гаробчанка піша т э а т р а л ь н а. Эмацыйна ўражлівыя замалёўкі асобных карцін, эпізодаў, вобразна-мастацкіх дэталей трымаюць чытача ў пастаянным напружанні, робяць яго саўдзельнакам аўтара, прымушаюць ў штосці ўглядацца, чагосці чакаць, абурацца альбо захапляцца... адным словам, атрымліваць эстэтычную асалоду. І яшчэ доўга захоўваецца хвалюючае «послевкусие» ад адчування непаўторнага водару тэатра.

Т. Гаробчанка піша і для аматараў сцэнічнага мастацтва, і для прафесіяналаў. Яе нататкі можна знайсці на старонках часопісаў «Полымя», «Нёман», «Тэатральная творчасць», «Мастацтва», «Беларуская думка», «Роднае слова», газет «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Савецкая Беларусь», «Звязда», «Чырвоная змена». Артыкулы крытыка прываблівають змястоўнасцю, канцэптуальнасцю, дакладнасцю і лаканічнасцю выказаных думак. Што выгадна адрознівае іх ад вялікай колькасці матэрыялаў, у якіх за квяцістасцю фраз, віціеватасцю выразаў, зігзагаў выкладання губляецца асноўны сэнс і чытач ужо не разумее... навошта ж аўтар ўзяўся за пяро. Шкада, што лепшае, найбольш значнае з напісанага Т. Гаробчанкай не выдадзена асобным крытычным зборнікам. Такую кніжку чытач несумненна сустрэў бы з цікавасцю. Яна спрыяла б стварэнню даволі поўнага ўяўлення аб стане беларускай драматургіі, рэжысёрскага і акцёрскага майстэрства, аб пошуках тэатрамі адметнага стылю і вобразнай мовы ў пэўны адрэзак часу.

Т. Гаробчанка – выпускніца першага набору тэатразнаўчага аддзялення, адкрытага ў 1962 г. ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. У «вялікае» мастацтвазнаўства яна ўвайшла на пачатку 1970-х з даследаваннем купалаўскай драматургіі. Яе навуковым кіраўніком быў Анатоль Сабалеўскі. Дарэчы, са шматлікіх выхаванцаў, якія потым будуць у яго, Т. Гаробчанка стала ці не самай адданай яго вучаніцай, верным сябрам, надзейнай памочніцай, якая да апошніх дзён жыцця свайго настаўніка была побач. Усё ўзятае ад вялікага вучонага і педагога яна перадавала і сваім вучням, шмат гадоў працуючы выкладчыкам у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Сярод яе выхаванцаў кандыдаты навук, даследчыкі і педагогі, тэатральныя крытыкі, дырэктары тэатраў і загадчыкі літаратурнай часткі, мэнэджэры. На яе рахунку шматлікія кансультацыі і апаніраванне дысертацый. Тамара Яўгенаўна вельмі клапатлівы і ўважлівы педагог, з адказнасцю ставіцца яна да працы, прыкладаючы шмат намаганняў для раскрыцця і падтрымкі юных дараванняў. І яны адказваюць ёй удзячнасцю.

Час прапаноўваў і навязваў крытыкам розныя ролі. Канстантай жа творчай індывідуальнасці Т. Гаробчанкі з'яўляецца перакананне ў тым, што тэатр здольны, больш таго, павінен стаць месцам, дзе чалавек адчувае сябе часцінкай сусвету, упарадкаванага Стваральнікам. Яна ўпэўнена, што жывое, дзейснае мастацтва сцэны валодае выключнай магчымасцю падтрымаць чалавека ў яго супрацьстаянні бязладдзю і парушанай гармоніі, здольна дапамагчы людзям захаваць сваю годнасць і духоўную існасць. У гэтым, на думку тэатразнаўцы, сапраўдная сутнасць тэатра. Пра гэта і адна з лепшых кніг аб сучасным беларускім тэатры – «На мяжы стагоддзяў», дзе Т. Гаробчанка выяўляе духоўныя вытокі нацыі, звязаныя з сакральнай традыцыяй, засцерагае ад распаўсюджвання антыкультуры.

Яна не прымае тэатр які, выяўляючы драматызм і трагізм светаадчування чалавека XXI ст., замест асэнсавання складаных працэсаў рэчаіснасці, бясстрасна фіксуе іх, «смакуе» пачварныя з'явы жыцця. Можа з гэтай прычыны ў апошні час ўсё радзей і радзей яе можна заўважыць ў глядзельнай зале. Памыляюцца тыя, хто лічыць, што прафесія крытыка знаходзіцца ў пастаяннай канфрантацыі з творцамі і іх узаемадачыненні маюць пераважна канфліктны характар. Сярод шматлікіх сяброў Тамары Яўгенаўны – акцёры і рэжысёры, творчыя дзеячы.

Уменне сябраваць – неверагодная раскоша яе душы. Яна вельмі ўважлівы і чулы чалавек, ёй можна даверыцца, ведаючы, што заўсёды знойдзецца разуменне і водгук у яе сэрцы. На яе дапамогу можна разлічваць.

Т. Гаробчанка сярод тэатразнаўцаў карыстаецца бясспрэчным аўтарытэтам. Набыткі яе шматгадовай крытычнай дзейнасці важкія і плённыя. Даследчыца ўпершыню ў айчынным мастацтвазнаўстве сабрала і прааналізавала вялікі матэрыял па праблемах беларускай тэатральнай крытыкі і тэатразнаўства (найбольш поўна яны прадстаўлены ў «Гісторыі беларускага тэатра»), апублікавала шэраг брашур, з'яўляецца сааўтарам шматлікіх калектыўных прац. На яе рахунку значная колькасць артыкулаў для энцыклапедычных выданняў. Вялікая працаздольнасць і талент зрабілі Тамару Яўгенаўну выбітнай асобай у беларускай тэатральнай культуры ХХ ст., асобай, якая дае прыклад сённяшнім пакаленням тэатральных дзеячаў, як трэба жыць і працаваць у абранай прафесіі, паважна і адказна ставіцца да сваёй працы.

**Спіс літаратуры:**

1. Дранько-Майсюк, В. 20 фактаў пра Ўладыслава Галубка / Васіль Дранько-Майсюк // Svaboda.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://www.svaboda.org/a/29942962.html. – Дата доступу : 20.03.2020.
2. Уладзіслаў Галубок. Вяртанне // Histmuseum.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://histmuseum.by/by/news/990. – Дата доступу : 20.03.2020.
3. Уладзіслаў Іосіфавіч Галубок (біяграфія) // Theater.museum.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://theater.museum.by/be/node/20385. – Дата доступу : 20.03.2020.

*Алла Непочелович*

## ВОЗРОЖДЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ДРЕВНИХ ТЕХНОЛОГИЙ БЕЛОРУССКОГО ТЕКСТИЛЯ В КОНТЕКСТЕ СОВРЕМЕННОСТИ

*Alla Nepochelovich*

## REVIVAL AND DEVELOPMENT OF ANCIENT TECHNOLOGIES OF BELARUSIAN TEXTILES IN THE CONTEXT OF MODERNITY

*В статье рассматриваются методы подготовки будущих специалистов в сфере отечественной культуры и искусства на примере обучения студентов в творческой мастерской «Художественное ткачество» кафедры народного декоративно-прикладного искусства БГУКИ. Автор анализирует процессы трансформации старинных технологий в новые формы современных текстильных произведений.*

*The article discusses the methods of training future specialists in the field of domestic culture and art on the example of teaching students in the creative workshop «Art Weaving» of the Department of Folk Decorative and Applied Arts of the Belarusian State University of Culture and Arts. The author analyzes the processes of transformation of ancient technologies into new forms of modern textile works.*

Традиционная культура является неотъемлемой частью комплексной системы стабильного развития любого общества. Ей принадлежит существенная объединительная роль в современном мире. В нашей стране значительное внимание уделяется гармоничному развитию культурной жизни народа, в том числе и процессам формирования профессиональной школы декоративно-прикладного искусства Беларуси. Первоочередной задачей в данном направлении является возрождение, сохранение и развитие уникальных местных традиций в современном этноискусстве страны. Ее выполнение состоит из ряда компонентов объективного и субъективного характера. В частности, к ним относится такой компонент, как преемственность художественного мастерства от поколения к поколению.



Рисунок 1 – Неолитический вертикальный трацкий станок V тыс. до н. э. с каменными отвесами из Центральной Европы [1, с. 33]




Рисунок 2 – Афиша «ТекСтильный букет». Минск, 2020



Рисунок 3 – Л. Шилак & О. Матусевич. Коллекция исторических костюмов «Барбара». Минск, 2020 [2]

По мнению В. Калацея [1, с. 33–34], как и в ряде близлежащих регионов Европы, текстиль появился в Беларуси еще в неолите (рис. 1). По мере развития технологий производство большинства промышленных тканей взяли на себя ремизные ткацкие станки, зато и сегодня по старым технологиям все еще изготавливаются авторские гобелены и декоративные вставки для этнографического и исторического костюма, а также различные виды традиционного текстиля для сельского (или стилизованного под сельский) интерьера. Взаимосвязь традиционного текстиля с богатым наследием корневой художественной культуры нашей страны как части европейского культурного пространства обогащает современное искусство, наполняет его глубоким смыслом и содержанием. Вследствие этого, происходит последовательная трансформация трактовки традиционных приёмов композиционной и орнаментальной организации в новые формы. Постепенный процесс преобразования наблюдается во всех видах декоративно-прикладного искусства. Современные произведения большинства белорусских художников-текстильщиков отличаются характерным национальным стилем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ